УДК 378:323.12

**М. Я. Сяменчык**, доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры (БДТУ)

# БАРАЦЬБА З ПРАЯВАМІ АНТЫСЕМІТЫЗМУ ЯК ЭЛЕМЕНТ ІДЭАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ УСТАНОЎ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Артыкул асвятляе адзін з аспектаў ідэалагічнага выхавання студэнтаў вышэйшых навучальных установ, звязаных з неабходнасцю барацьбы з праявамі антысемітызму. Паведамляецца аб стане вывучэння гэтай праблемы ў навуковай літаратуры і змесце вучэбных праграм па грамадскіх дысцыплінах. Разглядаюцца праявы антысемітызму ў Беларусі на розных этапах яе гісторыі. Абрунтоўваецца грамадская патрэба фарміравання ў студэнтаў ідэйнай перакананасці ў антыгуманнай сутнасці юдафобіі і неабходнасці барацьбы з яе праявамі.

One of the aspects of ideological education of university students, related to the necessity to fight manifestations of anti-Semitism, is elucidated in the present article. The research status of this issue in science literature and curriculum content of social sciences is reviewed. Manifestations of anti-Semitism in Belarus at the different stages of its history are reviewed. The author emphasizes public necessity of forming students' ideological conviction in inhumane nature of anti-Semitism and the necessity to combat its manifestations.

**Уводзіны.** У век інавацыйных тэхналогій і фарміравання інфармацыйнай цывілізацыі сусвет імкнецца вызваліцца ад такіх рудыментаў аўтарытарных і таталітарных палітычных сістэм, як войны, тэрарызм, беднасць і бяспраўе людзей. Часам, нават нягледзячы на заканадаўчую забарону сацыяльнай, расавай, рэлігійнай і нацыянальнай варажнечы, яе праявы маюць месца нават у дэмакратычных грамадствах. Прыкладам яе ў нашай рэспубліцы можна назваць антысемітызм ці, больш дакладна, юдафобію як нецярпімае і абразлівае стаўленне да яўрэяў з боку асобных прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

**Асноўная частка**. Акрамя спецыяльных службаў, значная доля агульнага клопату ўрада па прадухіленні нацыянальных канфліктаў ускладзена на выхаваўчыя і ідэалагічныя органы, у тым ліку на навучальныя установы. Дзеючая Праграма бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь на 2011–2015 гг. скіроўвае працу выкладчыкаў на выкарыстанне і ўкараненне «ідэалогіі беларускай дзяржавы, агульначалавечых, гуманістычных каштоўнасцей, культурных і духоўных традыцый беларускага народа» [1].

Па словах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі, звернутых да педагогаў краіны, «самае галоўное – закласці ў падрастаючае пакаленне цвёрды ідэйны і маральны стрыжань, які дазволіць процістаяць усялякім палітычным падкопам і правакацыям» [2]. Па сутнасці, тыя ж акцэнты прысутнічаюць і ў «Асноўных напрамках ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах вышэйшай адукацыі» [3].

Узяты беларускай вышэйшай школай курс на далучэнне да Балонскага працэсу вымагае ад усіх устаноў адукацыі ўдзелу ў вырашэнні комплексу праблем, звязаных з захаваннем нормаў міжнацыянальных адносін студэнтаў у полікультурнай адукацыйнай прасторы, што надзвычай актуалізуе патрэбу выхавання ў беларускіх студэнтаў імунітэту супраць любых праяў расізму і чалавеканенавісніцтва, у тым ліку юдафобіі. Таму патрабаванні Прэзідэнта аб выхаванні патрыётаў варта трактаваць больш шы-рока, маючы на ўвазе і здольнасць студэнта даваць адпор правакатарам.

Відавочна, што барацьба з праявамі юдафобіі павінна з'яўляцца абавязковым элементам ідэалагічнага выхавання студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі. Нельга не заўважыць яе ўзросшай актуальнасці ва ўмовах бесперашкоднай дзейнасці Інтэрнэту, які, акрамя іншага, зрабіўся для навучэнцаў важнай крыніцай пашырэння іх светапогляду. Але каб знойдзеная ў «сетцы» інфармацыя спрыяла разумоваму і духоўнаму развіццю студэнтаў, патрэбна каб яна лягла на трывалы грунт атрыманых навуковых ведаў і сфарміраваных ідэйна-маральных якасцей. Як вядома, навучанне і ідэалагічнае выхаванне не абмяжоўваецца толькі сценамі ўніверсітэта і не вычэрпваецца толькі падручнікамі і выкладчыцкімі лекцыямі. Але менавіта ад зместу грамадскіх дысцыплін і спосабаў іх падачы залежаць асноўныя вынікі ідэйна-маральнага фарміравання асобы студэнта.

Між тым, у праграмах выкладання ў негуманітарных установах вышэйшай адукацыі па гісторыі Беларусі, паліталогіі і ідэалогіі беларускай дзяржавы ні словам не прыгадана аб неабходнасці крытыкі экстрэмісцкіх ідэй, барацьбы з імі і іх носьбітамі. Нават ў апошняй тыпавой вучэбнай праграме інтэграванага модуля па гісторыі для ўстаноў вышэйшай адукацыі не прыгадваецца ніякіх звестак пра стан нацыянальных адносін у Беларусі. Тое ж уласціва вучэбнай праграме і вучэбна-метадычнаму дапаможніку па асновах ідэалогіі і праграме па паліталогіі.

Тым не менш нават пры наяўнасці пэўных хібаў сапраўдны выкладчык не будзе чакаць часу іх выпраўлення, а пачне сваю працу, абапіраючыся на Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, Кодэкс аб адукацыі і іншыя прававыя і дырэктыўныя дакументы. У дадзеным выпадку менавіта ад выкладчыкаў студэнты павінны даведацца аб міжнацыянальных адносінах у нашай краіне ў далёкім мінулым і ў цяперашні час.

Студэнтам неабходна асвятліць гісторыю ўзнікнення антысемітызму як больш ці менш тэарэтычнага абгрунтавання нянавісці да яўрэйскай нацыі. Ім трэба давесці, што калі ў XIX – пачатку XX стагоддзя ў Заходняй Еўропе непрыхільнасць да яўрэяў не выходзіла за межы пабытовага антысемітызму, то ва Усходняй Еўропе іх становішча характарызавалася поўным бяспраўем. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і вырашэння Венскім кангрэсам лёсу астатняй Польшчы яўрэі апынуліся ў Расіі, па вызначэнні У. І. Леніна, «турме народаў». Апафеозам царскай палітыкі, дзейнасці прадстаўнікоў дзяржаўнай рэлігіі і часткі праваслаўных інтэлігенцыі з комплексам непаўнавартасці, чынавенства і маргінальных пластоў зрабіліся яўрэйскія пагромы. З пачаткам І сусветнай вайны расійскія яўрэі трапілі ў яшчэ цяжэйшае становішча. Улады падазравалі іх у сімпатыях да Аўстра-Германскага блоку і шпіянажы на яго карысць. Ім забаранялі перапіску на роднай мове, уладкаванне на працу ва ўстановы па абслугоўванні фронту, а частка сінагог была рэквізавана пад салдацкія казармы. Характэрна, што царскі ўрад не рабіў палёгкі для яўрэяў, мабілізуючы іх у войска і даручыўшы ім зброю, але не ішоў на тое, каб даваць лепшым з іх афіцэрскія званні. Толькі са звяржэннем самаўладдзя яўрэі пазбавіліся ўсіх форм прыгнёту і дыскрымінацыі: яны сталі займаць пасады ўрадавых камісараў, старшынь гарадскіх дум і ўпраў. Была таксама скасавана мяжа яўрэйскай аседласці.

Тэндэнцыя да ўзрастання колькасці яўрэяў ва ўрадавых органах захавалася і пасля ўсталявання Савецкай улады. Юдафобства само па сабе не знікла: яно або перайшло ў бытавую сферу, або да часу сябе не выяўляла. Так, сталінскі рэжым, выступаючы пад сцягам пралетарскага інтэрнацыяналізму, прадаставіў яўрэям рэальную роўнасць з іншымі народамі, але, па сутнасці, пазбавіў іх правоў на нацыянальнае жыццё. Напрыканцы свайго існавання ён стаў выяўляць антысеміцкія прыкметы (барацьба супраць Яўрэйскага антыфашысцкага камітэта, забойства С. М. Міхоэлса, «справа ўрачоў» і інш.).

Варта было выбухнуць у 1967 г. араба-ізраільскай вайне, як ў СССР ізноў пачалася дыскрымінацыя яўрэяў. Афіцыйна КПСС не абвяшчала палітыку антысемітызму, але яна паспяхова ажыццяўлялася пад лозунгам барацьбы з сіянізмам. У выніку савецкім яўрэям былі створаны перашкоды для кар'ернага росту, абмежавана кола даступных ім прафесій, забаронены выезд за мяжу і многае іншае, што рабіла іх жыццё невыносным і штурхала да эміграцыі.

У 1970–80-я гг., паводле негалосных установак КПСС, у БССР сталі распаўсюджвацца антысеміцкія опусы накшталт «Ползучей контрреволюции» У. Бегуна, «Осторожно: сионизм» Ю. Іванова і інш. Пасля масавага «сыходу» яўрэяў у далёкае замежжа сыйшла ў нябыт і КПСС, але многія з яе актывістаў, хто шчыраваў на ніве антысемітызму, працягвалі сваю справу. У іх ліку былі В. Чыкін, І. Гукоўскі, І. Асінскі, В. Вольскі і інш. [4]. Сюды ж можна было дадаць аўтараў такіх брудных лісткоў, як «Политический собеседник», «Политика. Позиция. Прогноз» і «Славянский набат». Характэрна, што з ад'ездам яўрэяў крызісныя працэсы ў СССР не сціхлі, а яшчэ больш узмацніліся. І нават ачмуранаму антысіяніскай прапагандай абывацелю рабілася ясна, што вінаватыя ва ўсіх яго бедах не яўрэі, а няздольнае да прагрэсу кіраўніцтва КПСС і яе мясцовыя апаратчыкі.

З моманту ўтварэння суверэннай Рэспублікі Беларусь сітуацыя значна памянялася да лепшага. З'явілася праўдзівая літаратура пра яўрэяў такіх аўтараў, як Я. Анішчанка, Я. Басін, І. Герасімава, Э. Іофе, В. Селяменеў, Л. Смілавіцкі. Але і сёння можна сустрэць ў навуковым часопісе (да прыкладу, пра яўрэйскія партыі), ці ў падручніку (да прыкладу, пра «жыдоўска-масонскую змову») наскокі на яўрэяў. Гэтыя аўтары – у мінулым партыйныя актывісты – скарыстоўваюць любую магчымасць, каб брыкнуць «сусветны сіянізм». Адпаведныя заклікі, між іншым, гучалі пад час «Славянскага маршу», які адбыўся ў Магілёве [5].

Асобнай тэмай для размовы са студэнтамі павінен стаць Халакост – планамернае знішчэнне нацыстамі яўрэяў. Кожны наш грамадзянін ведае аб іх знішчэнні ў гета Баранавіч, Брэста, Гродна, Магілёва, Мінска, Пінска і многіх іншых гарадоў, а таксама аб «праведніках» – тых з беларусаў, хто ратаваў яўрэяў ад непазбежнай пагібелі. Усведамляючы неабходнасць процідзеяння юдафобскім сілам і сыходзячы з задач ідэалагічнага выхавання, Міністэрства адукацыі надае шмат увагі гэтай праблеме. Так, у ліку іншых мерапрыемстваў у 2008 г. ім быў праведзены рэспубліканскі конкурс «Халакост. Гісторыя і сучаснасць». Варта заўважыць, што дзве працы студэнтаў БДТУ (навуковы кіраўнік І. М. Рыжанкоў) былі адзначаны дыпломамі.

Змест 50 артыкула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь: «Знявага нацыянальнай годнасці

праследуецца адпаведна закону» [6] стаіць на варце аднаго з асноўных правоў чалавека. Прадухіленне распаўсюджання антыгуманных, у тым ліку юдафобскіх, ідэй і акцый на Беларусі складае важнейшую задачу сілавых і ідэалагічных службаў. Вынікам іх дзейнасці зрабілася адсутнасць дзяржаўнага антысемітызму [7].

Разам з тым заўважым, што бытавое юдафобства не такая ўжо бяскрыўдная, а дастаткова небяспечная з'ява, якая пры пэўных умовах здольна дэстабілізаваць грамадскае жыццё. А па-другое, юдафобы сталі пераносіць сваю пячорную нянавісць у Інтэрнэт. Зараз яны дзейнічаюць амаль легальна на адмысловых сайтах і форумах [8]. У прыватнасці, імі фарміруюцца чуткі, быццам фінансістамі кіеўскага Майдану з'яўляюцца яўрэйскія багацеі [9]. Нарэшце, вяршыняй гнюснасці з боку юдафобаў з'яўляюцца іх наскокі на Халакост, які абвешчаны імі «буйнейшай афёрай сусветнага сіянізму, яўрэйскай фінансавай мафіі, што настойліва імкнецца да сусветнага панавання» [10].

Відавочна, што ў віртуальнай прасторы поле ўздзеяння юдафобскіх матэрыялаў неабмежаванае і бескантрольнае, а значыць, і найбольш небяспечнае для маладых людзей, бо асноўнымі наведвальнікамі «сеткі» з'яўляюцца менавіта яны як найбольш мабільная частка грамадства. Тое ж студэнцтва ў пошуках крыніц для рэфератаў ці дакладаў, напрыклад па ідэалогіі беларускай дзяржавы, аб палітычнай сістэме, дзяржаўнай уладзе, міжнацыянальных адносінах і інш., можа сустрэцца з матэрыяламі экстрэмісцкага зместу.

**Заключэнне.** Такім чынам, на наш погляд, не варта спадзявацца толькі на ўласцівую беларусам талерантнасць. Як кажуць, дабро павінна быць з кулакамі, таму выкладчыку-грамадазнаўцу належыць прадбачыць магчымасць актывізацыі юдафобаў і своечасова забяспечыць студэнтам цвёрдыя ідэалагічныя перакананні, заснаваныя на ведах па гісторыі Беларусі, паліталогіі, асновах ідэалогіі беларускай дзяржавы і інш. У выніку шавіністы ўсіх масцей і правакатары павінны своечасова атрымаць адпор у першую чаргу ад тых, на каго яны робяць свае разлікі.

## Літаратура

1. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь на 2011–2015 гг. [Электронный ресурс] // Сайт БГТУ. URL: http://www.bstu.by/files/vospit_rab/27.rtf. (дата обращения: 02.04.2014).

2. Стенограмма выступления Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко на совещании педагогического актива Беларуси [Электронный ресурс] // Официальный интернет-портал Президента Республики. URL: http://www.president.gov.by/press126997.html (дата обращения: 02.04.2014).

3. Актуальные аспекты организации идеологической и воспитательной работы в учреждениях высшего образования в 2012/2013 учебном году: метод. рекомендации, утв. 10. 07. 2012. [Электронный ресурс] // Сайт Министерства образования Республики Беларусь. URL: http://edu.gov.by/main.aspx?guid=14281 (дата обращения: 02.04.2014).

4. Фейгин В., Басин Я. Национал-патриотические тенденции в средствах массовой информации Беларуси [Электронный ресурс] // Сайт общества «Еврейское наследие». URL: http: //www.jewish-heritage.org/jr2a21r.htm (дата обращения: 02.04.2014).

5. В Белоруссии состоялся Славянский марш [Электронный ресурс] // Сайт информационного агенства «Регнум». URL: http://www.regnum.ru/news/polit/1597610.html (дата обращения: 26.11.2012).

6. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с измнениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г.). Минск: Амалфея, 2008. С. 15.

7. В Беларуси нет государственного антисемитизма, заявил еврейский деятель [Электронный ресурс] // Сайт «Белорусские новости». URL: http://naviny.by/rubrics/politic/2012/10/22/ic_news_112_404074/ (дата доступа: 22.10.2012).

8. Кому нужно разжигание антисемитизма в России? [Электронный ресурс] // Сайт социальной сети «Макспарк» URL: maxpark.com/com-munity/8/content/1306148 (дата обращения: 02.04.2014).

9. Михаил Ошеров. Уроки Майдана [Электронный ресурс] // Сайт информационного агенства «Рекс.ру». URL: http://www.iarex.ru/articles/45382.html (дата обращения: 02.04.2014).

10. Холокост – громадная афёра на сотни миллиардов долларов? [Электронный ресурс] // Сайт Русского агенства новостей. URL: ruan.info/news_section.php?sid=13.13 (дата обращения: 07.06.2011).

*Паступіў 08.04.2014*